# Брацкая магіла савецкіх воінаў і партызан
# Скульптурная кампазіцыя “Маці”. “Воін”. “Партызан”








Святыня пасёлка – мемарыял загінуўшым воінам Чырвонай Арміі і партызанам за вызваленне раёна ў ліпені 1944 года.

На гары, на самым відным месцы ўзвышаецца велічны помнік. Вышыня стэлы 17 метраў. Помнік добра праглядаецца з боку вадасховішча, з гарадскога парку і з таго месца, адкуль пачынаўся штурм Зэльвы. Помнік быў узведзены ў 1958 годзе і ўяўляў сабой скульптуру воіна і партызанкі. У 1985 годзе ён рэканструяваны.

Тут, каля брацкай магілы воінаў і партызан, спыніліся адлітыя з металу абаронцы Радзімы – салдат і партызан, застыла ў вечным смутку маці.

Пахаваны ў брацкай магіле 506 воінаў Чырвонай Арміі, якія прадстаўлялі шматлікія нацыянальнасці нашай Радзімы. Імёны 270 з пахаваных у брацкай магіле засталіся невядомымі. Апошні прытулак у брацкай магіле знайшлі маёры Шапавалаў і Салаўеў, імёнамі якіх названы вуліцы пасёлка.

12 ліпеня Зэльва была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Немцы ў баях за пасёлак панеслі немалыя страты. Дорага каштавала вызваленне Зэльвы і воінам Чырвонай Арміі, аб чым сведчыць брацкая магіла.

У ліпені 1944 года воіны 169-й Рагачоўскай стралковай дывізіі 3-й арміі 2-га Беларускага фронту вялі цяжкія баі з праціўнікам на подступах да Зэльвы. Сіламі палкоў дывізій пачаўся штурм пасёлка з поўначы і поўдня. Гэта быў цяжкі, кровапралітны бой з ворагам за кожную вуліцу, кожны дом. Раніцай пасёлак быў вызвалены.

У 1970 годзе былі перезахаронены астанкі з адзіночных і брацкіх магіл із навакольных вёсак у агульную брацкую магілу ў г.п. Зэльва.

Дадатковая інфармацыя:
- 20 кастрычніка 1995 года праведзена перазахаванне трох невядомых з ляснога масіва за чыгуначным пераездам у раёне в.Галынка;
- 10 верасня 1997 года праведзена перазахаванне астанкаў двух невядомых, знойдзеных у в.Шулякі і каля дарогі Слонім-Зэльва.

**Адрас: Гродзенская вобласць, Зэльвенскі раён, г.п. Зэльва, 1944 г.**

**Бібліяграфія:**


1. Броска, Т. П. З гісторыі населеных пунктаў / Т. П. Броска // Памяць. Зэльвенскі раён : Гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / Рэдкал.: У. С. Богаў, Т. П. Броска, І. І. Васілеўка і інш. ; Уклад. Т. П. Броска ; Маст. Э. Э. Жакевіч. — Мінск : Паліграфафармленне, 2003. — С. 479.

2. Зэльвенскі раён // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Гродзенская вобласць / Акадэмія навук БССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, Беларуская Савецкая Энцыклапедыя. — Мінск : Беларуская Савецкая Энцыклапедыя, 1986. — С. 183—184. — (Збор помнікаў гісторыі і культуры народаў СССР).

3. Мемориалы и памятники, скульптуры и ландшафтные композиции Зельвенского района [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://turismplus.ru/memorialyi-i-pamyatniki-skulpturyi-i-landshaftnyie-kompozitsii-zelvenskogo-rayona.htm. — Дата обращения: 11.04.2019

4. Памятники и мемориалы | Гродненская область. Беларусь. Часть 1 [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://wwii.space/памятники-и-мемориалы-гродненская-об/4/. — Дата обращения: 11.04.2019.

5. Помнікі і брацкія магілы ахвярам фашызму на Зэльвеншчыне [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://pomnikizelva.blogspot.com/p/blog-page_32.html. — Дата обращения: 11.04.2019.

6. Увековечение памяти защитников Отечества и жертв войн [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://zelva.grodno-region.by/ru/pamyat-ru/. — Дата обращения: 11.04.2019.

7. Хільмановіч, В. А. Памяць, увекавечаная ў помніках і абелісках / Вольга Хільмановіч // Славуты Зэльвенскі край: матэрыялы навуковай гісторыка-краязнаўчай канферэнцыі “Старонкі гісторыі Зэльвеншчыны” (Зэльва, 12 снеж. 1998 г.) / Рэдкал.: Д. С. Аляшкевіч (гал. рэд.) і інш. — Ліда: ГАУПП “Лідская друкарня”, 2004. — С. 242—244.